# З Новым годам!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 21 снежня 2000 года, чацвер, № 17 (1829)


## *Уважаемые коллеги! Дорогие друзья!*

*Вот и подошел к концу последний год текущего тысячелетия. В такие дни миллионы людей в разных странах с помощью звезд и иными способами пытаются угадать свое будущее. Нам с вами ни к чему гадать на кофейной гуще.*

*Коллектив университета неплохо поработал в этом году и с достоинством готов встретить свой 80-летний юбилей. Уверен, и новый, 2001 год запомнится нам не только как первый год нового тысячелетия, но и как год свершений, преобразований, как год поступательного развития нашего университетского сообщества.*

*Пусть маститый профессор в новом году встретит своего лучшего ученика. Пусть юный первокурсник успешно сдаст первую сессию и станет полноправным членом университетской семьи. Пусть для всех нас наступающий год станет годом новых творческих успехов.*

*Желаю вам и вашим близким в новом году счастья, крепкого здоровья, оптимизма, благополучия. Пусть исполнятся самые смелые ваши мечты и пожелания. Пусть новый год принесет в ваш дом радость, душевный покой и веру в лучшее будущее.*

*Однако, встречая светлый праздник Рождества Христова, Новый год в кругу родных и близких, давайте не забывать, что у всех нас есть еще одна семья — университет. Давайте и в новом году сделаем все, чтобы поддержать высокую марку БГУ — лучшего университета страны. Ведь от результатов нашего с вами труда во многом зависит то, каким будет будущее Беларуси.*

*Ректор Белорусского государственного университета*
*профессор Александр КОЗУЛИН*



**НАПЯРЭДАДНІ**

## БДУ святкуе Новы год

Калядныя і навагоднія святы ва універсітэце будуць святкаваць весела і цікава. Ужо 24 снежня прафкам студэнтаў у канцэртнай зале "Мінск" праводзіць начную калядную дыскатэку "Спяваючыя фантаны". А 26 снежня ў актавай зале філалагічнага факультэта, на вуліцы К. Маркса, 31 для актывістаў будзе наладжаны навагодні вечар "Happy New Year 2001". Сёння ў прафкаме студэнтаў напоўніцу ідзе падрыхтоўка да гэтых мерапрыемстваў. Набываюцца падарункі для дзяцей маладых тат і мам.

Пра тых, хто працуе ва універсітэце, не забудзе прафкам супрацоўнікаў.

5 студзеня ў 12.30 ён арганізуе для самых маленькіх дзяцей (2—6 гадоў) тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам артыстаў ТЮГа. У той жа дзень крыху пазней, у 14.30, трапяць на касцюміраваную калядную казку больш старэйшыя дзеці, якім ад 6 да 12 гадоў. Ім абяцаюць свята з сюрпрызамі, гульнямі, розыгрышамі, конкурсамі, карагодамі і атракцыёнамі. 5 студзеня прафкам супрацоўнікаў ладзіць яшчэ і дыска-шоу ў 17.30. На ім павесяліцца змогуць ужо дарослыя. Іх чакаюць музычныя навагоднія прыгоды разам з ды-джэем "Дзедам Марозам", бязжурботныя КаВэЗэшнікі БДУ і вясёлыя дзяўчаты групы "ФЭНСІ". Не абыдзецца і без навагодніх падарункаў ад Дзеда Мароза.

*Вольга АНІНА*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 22.12.2000 | Танцавальна-забаўляльная праграма «Каляды з «UNISTAR», прысвечаная прэзентацыі Радыё БДУ | Палац спорту | 16.00 |
| 21.12.2000 | Навагодні вечар для студэнтаў | Інтэрнат № 3 | 19.00 |
| 22.12.2000 | Навагодні вечар для студэнтаў | Інтэрнат № 10 | 19.00 |
| 26.12.2000 | Навагодні вечар для студэнтаў | Інтэрнат № 7 | 19.00 |
| 30.12.2000 | Навагодні «агеньчык» для выкладчыкаў і супрацоўнікаў «Millenium у БДУ» | Актавая зала галоўнага корпуса | 20.00 |
| 02.01.2001 | Ранішнік для дзяцей супрацоўнікаў | Сталовая інтэрната № 5 | 11.00 |
| 05.01.2001 | Касцюміраваная калядная казка «Санта Клаўс у БДУ» | Актавая зала галоўнага корпуса | 12.30 — для малышоў, 12.30 — для сярэдняга ўзросту, 17.30 — для падлеткаў дыска-шоу |
| 07.01.2001 | Калядная вечарына для ўдзельнікаў маладзёжнага турніру па хакею «Масква-Мінск» пад патранажам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | Актавая зала галоўнага корпуса | 17.00 |

ГОСЦІ

# Венгр, які адкрывае для сябе Беларусь

*Студэнтам факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ пашанцавала. З гэтага навучальнага года замежную мову ім выкладае Петэр Альпэк. Ён прыехаў у наш універсітэт з Венгрыі, каб навучаць нашых студэнтаў нямецкай мове.*

*Пра тое, як ён трапіў у Беларусь, што яго найбольш уразіла, як адчувае сябе ў чужой краіне, Петэр Альпэк расказаў карэспандэнту "Беларускага універсітэта".*

**— Петэр, раскажыце, калі ласка, якім чынам Вы апынуліся ў Беларусі?**

— На самай справе трапіць у Мінск было няпроста. Жадаючых удзельнічаць у праграмах Нямецкай службы акадэмічных абменаў, праз якую можна паехаць на стажыроўку за мяжу, было шмат. Каб перамагчы, неабходна было мець рэкамендацыі, цудоўна валодаць нямецкай мовай, прапанаваць план працы... У Германіі ў Йенскім універсітэце я займаўся германістыкай — вывучаў нямецкую мову і літаратуру, гісторыю. Засвоіў методыку выкладання нямецкай мовы для замежнікаў. Атрымаў званне магістра. Нейкі час жыў і працаваў у Славакіі, дзе таксама выкладаў нямецкую мову ў Прэшаўскім універсітэце. Шчыра кажучы, у мяне была магчымасць выбраць — паехаць у Расію, Украіну ці Беларусь. Вырашыў паехаць у Мінск. Я чуў пра вашу краіну, і мне вельмі хацелася на свае вочы паглядзець, як тут жывуць людзі, пазнаёміцца бліжэй з вашай культурай, гісторыяй.

**— Петэр, а што больш за ўсё ўразіла, калі Вы прыехалі сюды? Якой уяўлялася Беларусь і якой Вы яе ўбачылі?**

— Ведаеце, калі ўжо стала вядома, што я паеду ў Беларусь, то я пачаў шукаць якую-небудзь літаратуру, каб больш даведацца пра вашу краіну. Але, на жаль, інфармацыі было мала. Не ўдалося нават знайсці карту Мінска. Так што ехаў з адчуваннем сустрэчы з невядомым.

І мне запомніўся дзень прыезду. Па-першае, было вельмі прыемна, што мяне сустрэлі ў аэрапорце. Па-другое, калі ехалі па галоўным праспекце, я быў прыемна здзіўлены: Мінск аказаўся такім чыстым, прыгожым. І я быў рады, што трапіў у Еўропу, няхай сабе і Усходнюю.

Мне падабаецца Беларусь, мару пабачыць і іншыя гарады — Нясвіж, Гродна, Брэст, Віцебск, Полацк... А яшчэ вельмі хачу вывучыць рускую і беларускую мовы.



Дарэчы, у Мінску шмат людзей, якія размаўляюць па-нямецку. Ёсць нямецкі Інстытут імя Гётэ. У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце працуюць выкладчыкі з Германіі... Я паспеў ужо наведаць залу замежнай літаратуры бібліятэкі БДУ, дзе можна знайсці шмат цудоўных кніжак на нямецкай мове. Я думаю, было б вельмі цудоўна арганізаваць Нямецкі клуб у Белдзяржуніверсітэце, каб была магчымасць сабрацца, паразмаўляць па-нямецку, запрасіць сяброў. Такія "нацыянальныя" клубы вельмі папулярныя ў іншых еўрапейскіх краінах.

Акрамя выкладання нямецкай мовы, я яшчэ распаўсюджваю інфармацыю і праводжу кансультацыі для студэнтаў, навукоўцаў, якія хацелі б паехаць на вучобу альбо стажыроўку ў Германію.

**— Вы ўжо больш за тры месяцы жывяце ў Мінску. Ці дужа цяжка Вам было прызвычаіцца да тутэйшага жыцця?**

— Прызвычаіцца было няцяжка. Мяне цудоўна сустрэлі ў БДУ. Усе вельмі прыхільныя, шмат дапамагаюць.

Калі ж казаць пра адмоўныя ўражанні, то гэта перш за ўсё грамадскі транспарт. Ведаеце, у Будапешце, напрыклад, таксама вельмі шмат людзей карыстаецца гарадскім транспартам, але ўсё адбываецца больш ветліва. У Мінску ж, асабліва ў гадзіны пік, вельмі цяжка бывае куды-небудзь дабрацца.

**— Петэр, а дзе Вы плануеце святкаваць Каляды і Новы год?**

— На святы паеду дадому ў горад Шопран, гэта на мяжы з Аўстрыяй. Дарэчы, ужо ведаю, якія падарункі прывязу сваёй сям'і і сябрам з Беларусі — вырабы народнай творчасці.

На жаль, не ўдалося набыць кнігу рэцэптаў беларускіх страў на нямецкай мове, каб падарыць яе маці — яна вельмі добра гатуе. Але я думаю, што на святочнай вячэры будзе, як заўсёды, шмат венгерскіх страў, падарункі, навагодняя ёлка.

*Гутарыла Таццяна КУХАРЧУК*

КАНФЕРЭНЦЫІ

# ДАКУМЕНТАЦЫЯ Ў ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ГРАМАДСТВЕ

Нядаўна ў Мінску прайшла канферэнцыя "Дакументацыя ў інфармацыйным грамадстве: роля і значэнне дакумента ў кіраўнічым працэсе". Яе арганізатарамі выступілі канцылярыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны камітэт па архівах і справаводстве і інш. Прысутнічалі прадстаўнікі аналагічных арганізацый з Расіі, Польшчы, Малдовы і іншых краін.

Разглядаліся пытанні расійскага і беларускага заканадаўства ў галіне дакументацыйнага забеспячэння. Не абмінулі на канферэнцыі ўвагай і найноўшыя распрацоўкі па аўтаматызацыі працэсаў дакументавання кіраўнічай дзейнасці. Абмяркоўваліся таксама праграмы беларускіх міністэрстваў і ведамстваў у сферы практычнага справаводства.

Як расказала Валянціна Палешчанка, начальнік упраўлення арганізацыйна-метадычнай работы і справаводства нашага універсітэта, якая таксама прымала ўдзел у рабоце канферэнцыі, многія спецыялісты выказалі занепакоенасць тым, што ў нашай краіне практычна не вядзецца падрыхтоўка дакументаведаў з вышэйшай адукацыяй. У той жа час у Расіі іх выпускаюць ажно 47 камерцыйных ВНУ. Патрэба ў спецыялістах такога кшталту вельмі вялікая, і іх праца высока аплочваецца.

Супакойвае той факт, што ў 2001 годзе на гістарычным факультэце ў БДУ плануецца ўвесці новую спецыяльнасць — дакументацыйнае забеспячэнне кіравання. І падрыхтоўкай дакументаведаў з вышэйшай адукацыяй усё ж пачнуць займацца і ў Беларусі.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

# ВІЗІТОЎКА БДУ – НАВУКОВА-ІНАВАЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Міжнародная канферэнцыя "Міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы інавацыйнай дзейнасці і трансферу тэхналогій" прайшла ў нашым універсітэце. Асноўнымі арганізатарамі форуму з'яўляліся БДУ і Дзяржкамітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь. Адкрыў сустрэчу рэктар БДУ прафесар А.У. Казулін. У сваім прывітальным слове ён падкрэсліў, што наш універсітэт сёння стаў не толькі найбуйнейшым цэнтрам адукацыі, навукі і культуры нашай рэспублікі, але і цэнтрам распрацоўкі і ўкаранення новых тэхналогій у самых розных сферах — ад хіміі лекавых прэпаратаў да касмічных тэхналогій. У нас ёсць таксама напрацоўкі па сумесных вытворчасцях з замежнымі партнёрамі: напрыклад, у пачатку новага года ва універсітэце будзе ўстаноўлена сучасная лінія па вытворчасці інфузійных раствораў з Германіі, якая будзе адпавядаць стандарту JMP.

Своеасаблівай ілюстрацыяй да абмеркавання стаў паказ распрацовак і дасягненняў універсітэта. У дзейнасці форуму прынялі ўдзел прадстаўнікі прамысловых кампаній Германіі і супрацоўнікі навукова-даследчых лабараторый БДУ. У ліку запрошаных замежных гасцей быў прэзідэнт АТ "Enoptik" і прэзідэнт гандлёва-прамысловай палаты Цюрынгіі Лотар Шпэт, а таксама прадстаўнікі партнёрскіх універсітэтаў і вышэйшых школ ФРГ, прэзідэнт фонду Штэйнбайса прафесар Лен, прадстаўнікі пасольства Рэспублікі Беларусь у ФРГ, кіраўнікі фірмаў — члены Клуба нямецкай эканомікі ў Беларусі і інш.

*Вольга АНІНА*

**ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ГУЛЬНІ**



# *Географы ведаюць, што Зямля круглая*

Восьмага снежня на геаграфічным факультэце адбыўся другі турнір па інтэлектуальных гульнях. Яго ідэя ўзнікла яшчэ год таму, калі вынікі турніру, які прайшоў 9 снежня 1999 года, не задаволілі вельмі многіх: засталіся пэўныя нявырашаныя праблемы... У выніку, калі на пачатку лістапада было аб'яўлена, што другі турнір адбудзецца, частка падрыхтоўчых мерапрыемстваў ужо прайшла. А потым цікавасць да турніру ўзрастала ўсё больш і больш. Асабліва гэтаму спрыяла ідэя выстаўляць каманды па курсах, што дазволіла пазбегнуць вылучэння яўнага фаварыта. Акрамя таго, наяўнасць каманды выкладчыкаў і перыядычнае з'яўленне чутак, што адной з дзвюх камандаў першага курса будзе прафесійная каманда з Мінскага клуба інтэлектуальных камандаў, яшчэ больш падагравалі цікаўнасць да мерапрыемства. У выніку атрымалася так, што перад турнірам камандаў, якія хацелі б прыняць у ім удзел, было значна больш за сем патрэбных. Акрамя таго, значная частка студэнтаў прыйшла на мерапрыемства не дзеля дыскатэкі, а «пахварэць» за сваіх калег (згадзіцеся, выпадак не зусім тыповы).

Дзякуючы такой мэтанакіраванай падрыхтоўцы турнір быў не толькі больш цікавым, але і праведзеным на больш якасным тэхнічным узроўні. Падчас адрыхцоўкі турніру яго вядучыя: Віталь Немагай, студэнт 4-га курса геафака БДУ, і Раман Альшэўскі, студэнт 3-га курса Беларускай акадэміі мастацтваў (ігракі каманды «Не чакалі», якая, дарэчы, з'яўляецца двухразовым чэмпіёнам Мінска па гульні «Брэйн-рынг») — падзякавалі камандзе «МІД-2» Мінскага клуба інтэлектуальных камандаў і асабіста П.А. Забаўскаму і С. Буяну за прадастаўленую гульнявую сістэму. Словы падзякі былі выказаны таксама ў адрас дэканата геаграфічнага факультэта і асабіста дэкана факультэта прафесара І.І. Пірожніка за падтрымку ідэі і ўсемагчымую дапамогу падчас падрыхтоўкі турніру. Падзяку за дапамогу атрымалі таксама прафкам і старшыня прафбюро Вадзім Грышчанка за прадастаўленыя прызы, а таксама аўтар гэтых радкоў за інфармацыйную падтрымку.

А потым пачалося свята. Першымі за стол селі каманда выкладчыкаў і каманда, складзеная з гледачоў падчас своеасаблівай віктарыны. Нягледзячы на падтрымку залай сваіх прадстаўнікоў выкладчыкі перамаглі з лікам 3:1.

У наступныя пары лёс звёў каманды другога і чацвёртага курса (перамаглі другакурснікі з лікам 3:1) і дзве каманды з першага курса (з лікам 3:0 перамагла каманда «Байканур»). А вось апошнюю пару склалі фіналісты мінулага турніру — каманда «Рыба», у якую ўвайшоў касцяк аднайменнай каманды, дапоўнены студэнтамі 4-га курса, і каманда 3-га курса «Брэвенцы», што стала мінулагоднім чэмпіёнам. Для ўдзельнікаў абедзвюх камандаў гэта было вялікай нечаканасцю і своеасаблівым датэрміновым фіналам. Але «Рыба» справілася з хваляваннем значна хутчэй і літаральна разграміла сваіх сапернікаў — 4:0!

Падчас паўфіналаў накал барацьбы ўзрос яшчэ больш. Гульня ішла ўжо да чатырох узятых пытанняў. У першай пары, дзе сустракалася каманда выкладчыкаў з камандай «Растафары» (2-і курс), лік адкрылі «настаўнікі». «Вучні» не разгубіліся і змаглі вырвацца наперад — 1:3. Аднак нягледзячы на такі працяг выкладчыкі знайшлі сілы аднавіць раўнавагу. А потым былі чатыры «прыгожыя» пытанні, падчас адказаў на якія кожная з камандаў магла перамагчы, аднак удача і прыхільнасць залы былі на баку студэнтаў. 4:3 — і «Растафары» ў фінале.

У другім паўфінале барацьба была не менш цікавай, аднак «Рыба» гуляла вельмі ўпэўнена і не пакінула аніякіх шанцаў на перамогу «Байкануру» — 4:1.

Фінальныя баі сталі заканамерным завяршэннем турніру. У матчы за 3-е месца выкладчыкі далі своеасаблівую «фору» сваім сапернікам, аднак потым не толькі адыграліся, але і вырваліся наперад — 2:3. Пасля некалькіх «няўзятых» пытанняў першакурснікі аднавілі раўнавагу, аднак перамагчы ўжо не змаглі. Пераможную кропку ў камандзе выкладчыкаў паставіў Я.У. Марозаў.

Гульня за першае месца даказала, што ў гэты вечар каманды, мацнейшай за «Рыбу», не знайшлося. Лік быў ужо амаль разгромны (4:0), калі ігракі «Растафары» змаглі ўзяць два пытанні, аднак гэта іх не выратавала. З лікам 5:2 мінулагодні фіналіст стаў сёлетнім чэмпіёнам.

Шчырую падзяку хацелася б выказаць не толькі пераможцам, але і ўдзельнікам усіх іншых камандаў. Вядома, усе яны пераможцамі стаць не маглі, аднак прыклалі шмат намаганняў, каб трапіць на п'едэстал, дэманструючы пры гэтым сапраўдную цікавасць і жаданне гуляць, прыносіць радасць сваім прыхільнікам. Так, хацелася б адзначыць даволі паказальны ўчынак Вячаслава Філімонава: звычайна ён гуляе за «Рыбу», але ў гэты вечар прыняў рашэнне выступіць за свой 3-і курс і таму не стаў чэмпіёнам, прайграўшы сваім сябрам-сапернікам у першым туры.

Асаблівую падзяку ад імя ўсіх прысутных хацелася б выказаць Віталю Немагаю, які рыхтуе і праводзіць ужо другі турнір па інтэлектуальных гульнях на геафаку. І варта адзначыць, што ўзровень гэтых турніраў расце. Канешне, пасля заканчэння можа быць мноства розных чутак і плётак наконт «свечаных» пытанняў, «здачы» гульняў і да таго падобнага. Але гэта звычайная з'ява для ўсіх звышпрынцыповых гульняў, калі ніхто не жадае саступаць. Ніхто не жадаў здавацца і на гэтым турніры. Так, напрыклад, Валерый Сысонаў, студэнт 4-га курса, які звычайна вельмі ахвотна каменціруе падобныя мерапрыемствы, пасля паражэння сваёй каманды ў першым туры літаральна не знаходзіў словаў, каб выказаць свае пачуцці. Намеснік дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце і капітан каманды выкладчыкаў М.В. Кухарчык адзначыў: галоўнае, што было ў гульнях яго каманды, — гэта інтрыга. «А таксама стабільнасць — мы другі год запар трэція,»— падтрымаў яго Я.У. Марозаў.

А ўсім, хто не стаў чэмпіёнам, хацелася б пажадаць не сумаваць і дачакацца наступнага турніру, дзе, магчыма, ім удасца расквітацца з цяперашнім чэмпіёнам і ўзяць свой двайны рэванш. Бо Зямля круглая, і ніколі не ведаеш, што можа здарыцца. Географы ж ведаюць гэта лепш за іншых.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*адказны за інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

**АБ'ЯВЫ**


**"ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ" БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Лабараторыя моцнатокавай электронікі:**
Старшы навуковы супрацоўнік — 1
**Лабараторыя гама-оптыкі:**
Старшы навуковы супрацоўнік — 1
**Лабараторыя эксперыментальнай фізікі высокіх энергій:**
Вядучы навуковы супрацоўнік — 1.
Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: 220050, г. Мінск, НДІ ЯП, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.




**ПАДАРОЖЖЫ**

# Дрэвы ахопам... у шэсць студэнтаў

*Самым актыўным студэнтам універсітэта, членам студсаветаў інтэрнатаў, лідэрам універсітэцкіх маладзёжных арганізацый студэнцкі гарадок БДУ і ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю падаравалі экскурсію ў Белавежскую пушчу і ў Камянец. Добра ўладкаваўшыся ў аўтобусе, каманда з 40 чалавек у 23 гадзіны рушыла з Мінска на захад. Ноч бавілі па-рознаму — байкамі, гульнямі, сном. Але пад раніцу ўжо нават самыя моцныя зламаліся...*

## СТАТЫСТЫЧНАЕ. ПРА ПУШЧУ

Знаходзіцца Белавежская пушча ў 60 кіламетрах на паўночны ўсход ад Брэста. У Беларусі яна размяшчаецца ў межах Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. Яе працягласць з захаду на ўсход 55 км, з поўначы на поўдзень — 51 км. Праз Белавежскую пушчу праходзіць дзяржаўная мяжа паміж Польшчай і Беларуссю, якая падзяляе пушчу на дзве прыкладна роўныя часткі.

Па сваіх памерах, па багацці і разнастайнасці флоры і фауны, па прыгажосці краявідаў Белавежская пушча займае першае месца сярод буйных еўрапейскіх лясных масіваў. Тут захаваліся ў прыродных умовах рэдкія звяры і птушкі, якія даўно ўжо зніклі ва ўсіх іншых краінах. Менавіта таму сёння Белавежская пушча з'яўляецца адным з самых тытулаваных запаведнікаў не толькі ў Еўропе, але, здаецца, і ва ўсім свеце. Яна ўваходзіць у Спіс сусветнай спадчыны чалавецтва (разам з возерам Байкал, дажджавымі лясамі Амазонкі, вадаспадам Вікторыя, Далёкаўсходняй далінай гейзераў і іншымі унікальнымі прыроднымі аб'ектамі). У 1997 годзе Белавежская пушча была ўзнагароджана дыпломам Савета Еўропы за поспехі ў справе аховы прыроды, пасля чаго яна трапіла пад апеку Савета Еўропы на 5 год.

...Экскурсія нашая пачалася з Музея прыроды на ўваходзе ў пушчу. Спачатку — звычайныя чучалы жывёл і тэарэтычнае знаёмства з разнастайнасцю жывога свету, які насяляе пушчу. Пасля — вандроўка па самой пушчы на аўтобусе. І напрыканцы — самастойнае знаёмства з жыхарамі запаведніка.

Здаецца, не толькі студэнты, але і самі звяры змерзлі і не выспаліся. Але чамусьці ніхто не скардзіўся. І адны, і другія былі задаволеныя сустрэчай і знаёмствам і нават спрабавалі падтрымліваць размову...

## ЛІРЫЧНАЕ. ПРА ПУШЧУ

Белавежская пушча ляжыць на самым захадзе Беларусі. Гэта адзін з апошніх астравоў таго першабытнага лесу, які пакрываў у старадаўнія часы ўсю Еўропу. Тут зусім не рэдкасць дрэвы ў паўтысячы год ахопам у шэсць студэнтаў. Тут са спрадвечных часоў вольна жыве зубр. Магутны, як сама зямля, і старажытны, як яе запаветныя нетры.

Адвечная цішыня. І шолах дрэў. Такі самы, як і ў каменным веку.

І побач з гэтым — сляды далікатнага, любоўнага ўмяшання чалавека: стагі, каб падкарміць узімку звяроў, музей, хаткі егераў, сучасная гасцініца. Мільганула думка: а можа, не ўсё яшчэ страчана? Для нашчадкаў сваіх захоўвае чалавек кветкі і дрэвы, жывёл і птушак.

Усё гэта — пушча. Усё гэта — неўміручая душа яе.

...Кажуць, экскурсія залежыць ад надвор'я і экскурсавода. Мабыць, у той дзень нам шанцавала. Надвор'е было проста цудоўнае. Экскурсавод аказалася на дзіва цярплівай і паведала нам шмат цікавага...

## ГІСТАРЫЧНАЕ. ПРА ПУШЧУ

Упершыню пушча згадваецца яшчэ ў ІІ стагоддзі ў запісах Герадота. Пазней звесткі пра гэты старажытны і нечапаны лес з'яўляюцца ў Іпацьеўскім летапісе 983 года. У тыя далёкія часы тут вадзіліся туры, тарпаны, зубры, дзікі, ласі, бабры. І што яшчэ цікава, археалагічныя раскопкі засведчылі, што ў дагістарычныя часы ў пушчы можна было сустрэць пячорнага мядзведзя, паўночнага аленя, мускуснага быка і маманта.

Жылі ў тыя часы ў пушчы плямёны яцвягаў. Яны займаліся паляваннем, лавілі рыбу... А ў 1276 годзе князь Уладзімір Валынскі заснаваў тут, на рацэ Лясной, горад-крэпасць Камянец.

У канцы XIII — пачатку XIV стагоддзя пушчай валодалі літоўскія князі Трайдзен, Кейстут, Ягайла. Зразумела, князі хацелі жыць у дастатку. Для гэтага неабходна было або ваяваць, або гандляваць. Пацяху ваявалі. Гандлявалі ў мірныя перапынкі. У 1413 годзе, калі адбылося аб'яднанне Літоўскага княства з Польшчай, Белавежская пушча перайшла да польскіх уладаў. Польскія каралі ператварылі пушчу ў месца сваіх шыкоўных паляванняў. Лес знішчаўся гандлем, а зубр амаль губляў

**АСОБЫ**

# УВАСАБЛЕННЕ ВАЛЬНАДУМСТВА І СМЕЛАСЦІ

*Новы помнік, які нядаўна з'явіўся ва універсітэцкім гарадку, знаёміць нас з беларускімі асветнікамі Сымонам Будным і Васілём Цяпінскім. У сённяшнім выпуску "Беларускага універсітэта" пра друкара і мысліцеля Сымона Буднага распавядзе даследчык старабеларускай літаратуры, вядомы навуковец Іван Саверчанка.*

Таленавіты пісьменнік, выдатны педагог, філосаф і багаслоў Сымон Будны — адзін з першарадных дзеячаў нашай старажытнай культуры, асоба еўрапейскага маштабу. Ён працягваў традыцыі, закладзеныя вялікімі папярэднікамі, славянскімі асветнікамі: Кірылам і Мяфодзіем, Еўфрасінняй Полацкай, Кірылам Тураўскім, Францішкам Скарынам...

Кнігі беларускага пісьменніка былі вядомыя ва ўсіх краінах Заходняй Еўропы. Яго гуманістычныя ідэі абароны свабоды чалавечага духу, палымяныя заклікі да панавання розуму і навукі ў грамадстве знайшлі водгук не толькі ў сэрцах суайчыннікаў, але і ў Германіі, Швейцарыі, Францыі, Англіі, Італіі, Маскоўскай Русі. С. Будны стаў увасабленнем вальнадумства і смеласці, сімвалам духоўнай велічы і таленту славянскіх народаў.

## ЖЫЦЦЁ І ТВОРЧАСЦЬ

Першая дакументальная згадка пра С. Буднага — кароткі запіс у метрыцы Кракаўскага універсітэта за 19 кастрычніка 1544 года, з якога можна меркаваць, што ён нарадзіўся прыкладна ў 1530 або ў самым канцы 1520-х гадоў у Будзе. Дзе знаходзілася тая Буда — загадка: вёсак з такой назвай у Беларусі, як і ў Польшчы, безліч. Аднак многае паказвае на карысць беларускага паходжання. Найперш, Будны кепска ведаў Польшчу. Гэта і не дзіўна: усё сваё свядомае жыццё ён пражыў у Вялікім княстве Літоўскім і толькі зрэдку выязджаў у Польскае каралеўства для ўдзелу ў пратэстанцкіх сінодах.

Аднак асабліва важна тое, што Будны напісаў свае першыя творы — "Катэхізіс" і "Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам" — пастарабеларуску. Матчынай мовай асветніка была беларуская. Пра гэта красамоўна сведчыць і яго палымяны заклік да князёў Радзівілаў шанаваць яе ва ўсе часы, берагчы як неацэнны скарб.

Дакладна невядома, дзе С. Будны атрымаў пачатковую адукацыю. Вядома толькі, што ў 1558 годзе Сымон Будны распачаў дзейнасць у Вільні. Ён выкладаў асновы тэалогіі ў пратэстанцкім зборы ў Вільні, атрымліваючы шчодрую па тым часе ўзнагароду. У сталіцы Вялікага княства Літоўскага ён не толькі знайшоў надзейны жыццёвы прытулак, але й атрымаў выдатную магчымасць удасканаліць талент педагога, пісьменніка, філосафа і багаслова.

Каля 1560 года С. Будны пераехаў з Вільні ў Клецк, дзе ў мясцовым кальвінскім зборы прадоўжыў справу, распачатую ў Вільні, адначасова рыхтуючы да друку свой першынец. Летам 1562 года з Нясвіжскай пратэстанцкай друкарні выйшла дыхтоўная, з густам аздобленая кніжка значных памераў — "Катэхізіс, або Старадаўняя хрысціянская навука для простых людзей". Яна адразу прыцягнула ўвагу адукаваных людзей як у Вялікім Княстве, так і далёка за яго межамі. Незаменная чытанка для дарослых і выдатны падручнік для дзетак, друкаваны "Катэхізіс" быў адначасова неардынарным філасофска-багаслоўскім творам. Ён выклікаў шырокую літаратурную палеміку.

Літаральна праз тры месяцы пасля з'яўлення "Катэхізіса", 11 кастрычніка 1562 года з Нясвіжскай друкарні выйшаў новы твор С. Буднага— "Апраўданне грэшнага чалавека перад Богам". Кніга прысвячалася земскаму падскарбію Вялікага княства Літоўскага, вядомаму дзяржаўнаму дзеячу Астафею Валовічу, які выдаткаваў значную суму на пабудову і абсталяванне Нясвіжскай друкарні. На жаль, да цяперашняга часу не захавалася ніводнага экземпляра "Апраўдання" С. Буднага.

У Клецку Сымон Будны працягваў самаадукацыю. Ён набываў для сваёй бібліятэкі кнігі заходнееўрапейскіх аўтараў, апантана аналіза-



апошняе месца свайго жыхарства. І так хацелася палявацьі!.. Таму ўжо вельмі хутка польскія князі самі прызначылі строгія правілы аховы дзікіх звяроў. Так зубр выратаваў пушчу.

У 1795 годзе Белавежская пушча ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Плошча яе ў той час складала амаль 120 дзесяцін. І Кацярына II, мала дбаючы пра лёс пушчы, раздавала лес направа і налева сваім фаварытам — Румянцаву, Кутузаву, Дранякіну. Пры гэтым царская сям'я прымала ўсе магчымыя меры для павелічэння колькасці жывёл. Так, у 1802 годзе Аляксандр І выдаў указ аб запаведнасці пушчы і ахове зуброў.

У 1888 годзе пушча перайшла непасрэдна ва ўласнасць цара. Ужо праз год у Белавежы (сёння гэта ў Польшчы) пачалося будаўніцтва велізарнага імператарскага палаца. Пазней сюды прыязджаў на адпачынак цар з сям'ёю і дваром. Да палаца для зручнасці была нават падведзена чыгунка. З таго часу паляванні сталі не проста шыкоўнымі, а... Так, толькі 27 верасня 1852 года тут былі забіты 42 зубры, 18 зубрых, 6 зубранятак. Крыху раней у пушчы быў цалкам вынішчаны высакародны алень.

Царскі ўрад сек на карабельныя мачты лепшыя дубы і хвоі. Газета "Колокол" (1861) выступіла з артыкулам "Цёмная справа". Рускія навукоўцы спрабавалі наладзіць у пушчы даследаванні, дабіліся спынення высечкі лесу, правялі лесаўладкаванне, абнеслі пушчу ровам і плотам.

У часы Першай сусветнай вайны пушчу заняло нямецкае войска. Тады за два з паловай гады ў Германію было вывезена 4,5 млн. кубаметраў драўніны. Гэта амаль столькі ж, колькі яе было нарыхтавана тут за ўсю папярэднюю гісторыю (5 млн. кубаметраў).

Пасля заканчэння вайны пушча зноў перайшла да Польшчы. На той час ужо 20 % яе тэрыторыі былі вынішчаны.

Ішоў час. І ўжо зусім хутка ў старажытнага ляснога абшару з'явіўся новы гаспадар: у 1939 годзе Белавежская пушча ўвайшла ў склад БССР, і пастановай Савета народных камісараў на яе тэрыторыі быў арганізаваны Беларускі дзяржаўны запаведнік "Белавежская пушча".

Падчас Другой сусветнай вайны (на дзіва!) немцы амаль не эксплуатавалі пушчу. Герынг, адзін з бліжэйшых паплечнікаў Гітлера, прыняў рашэнне стварыць на тэрыторыі пушчы ўзорную паляўнічую гаспадарку Рэйха, дзе маглі б паляваць высокія тытулаваныя асобы.

Пасля вайны запаведнік працягнуў сваё звыклае існаванне. Але зноў у новых межах, таму што пушча была падзелена паміж Польшчай і Беларуссю. Пасёлак Белавежа, Нацыянальны парк і зубрапітомнік адышлі да Польшчы. А Беларусі зноў давялося ствараць сваю базу для навуковых даследаванняў.

У жніўні 1957 года дзяржаўны запаведнік быў рэарганізаваны ў Дзяржаўную запаведна-паляўнічую гаспадарку (ДЗПГ). За кароткі тэрмін у Белавежскай пушчы быў пабудаваны комплекс "Віскулі", які пазней стаў сусветна вядомым месцам.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Белавежская пушча была абвешчана Дзяржаўным нацыянальным паркам.

### ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА. І НЕ ТОЛЬКІ

Белавежская пушча — гэта адзінае ў свеце месца, дзе жыве на волі зубр. Нам пашанцавала. Мы паціху пасоўваліся на сваім аўтобусе ў паўночны куток пушчы, як раптам заўважылі ў трох метрах ад нашай дарогі цэлы статак зуброў. Нездарма называюць зубра гаспадаром пушчы. Увесь выгляд яго здзіўляе веліччу і магутнасцю. Зубр, ён хоць і вялікі, але, здаецца, студэнтаў спалохаўся. Увесь статак хуценька разбегся па хмызняках. Але ж мы іх бачылі! А гэта была галоўная мэта ўсёй вандроўкі.

...Аўтобус спяшаецца назад, у Мінск. "Ну як адчуванні, уражанні?"— пытаюся ў народа. Здаецца, усе задаволеныя, крыху здзіўленыя нечаканай прыгажосцю і дагледжанасцю пушчы, чырвоным колерам Белай вежы ў Камянцы і цудоўным сонечным надвор'ем, якое трымалася ўвесь дзень (дарэчы, назаўтра зноў вярнуўся дождж і халады).


*Крысціна СТАНКЕВІЧ,*
*кіраўнік інфармацыйнай службы студэнцкага гарадка БДУ*


**P.S. Гэтае падарожжа — не першае і не апошняе. Праця будзе...**

---



КАТИХИЗІСЪ.
ТО ЕСТЬ,
ѾПЕРВѢВАГО СВЕТОГО АПОСТОЛА
Петра послания. Зачало 5.

ваў творы грэчаскіх і лацінскіх апалагетаў хрысціянства, асабліва шануючы Тамаша Аквінскага. Пасля выдання польскамоўнай Брэсцкай Бібліі 1563 года асветнікам авалодала ідэя зрабіць новы, больш дасканалы пераклад Свяшчэннага Пісання і выправіць нарэшце хібы, што з розных прычынаў трапілі ў яго на працягу некалькіх стагоддзяў. У здзяйсненні гэтай грандыёзнай задумы С. Будны разлічваў на матэрыяльную падтрымку М. Радзівіла — не толькі сталага фундатара і арганізатара кнігавыдавецкай справы, але і чалавека, які сам выступаў як неблагі пісьменнік-публіцыст.

Аднак ажыццявіць свой план перакладу Бібліі ў той час С. Будныму не ўдалося. У 1565 годзе Мікалай Радзівіл Чорны памёр. Сымон Будны, як і ўвесь рэфармацыйны рух Беларусі, страціў сваю галоўную апору. Неспадзяваныя абставіны прымусілі беларускага гуманіста шукаць новы прытулак.

Час няпэўнасці быў кароткім: недзе ў канцы 1565 ці на самым пачатку 1566 года яго запрасіла ў Хоўхава Ганна Кішчына, віцебская ваяводзіна, кіраўніком (або, як тады казалі пратэстанты, міністрам) тамтэйшага арыянскага збору. У жыцці асветніка пачаўся новы перыяд.

Дзесьці ў канцы 1570 года, прыкладна пасля 5—6 год руплівай працы, С. Будны нарэшце надрукаваў у Нясвіжскай друкарні пад аднной вокладкай пераклад Новага Запавету і апокрыфаў. Кніга адразу стала найбуйнейшай з'явай духоўнага жыцця 70-х гадоў XVI стагоддзя.

Каля 1571 года С. Будны з невядомых сёння прычын пакінуў Хоўхава і пераехаў у Заслаўе да менскага кашталяна Яна Глябовіча, дзе пражыў каля двух год. Тут у чэрвені 1572 года асветнік скончыў працу над перакладам кніг Старога Запавету, якія неўзабаве разам з перапрацаваным Новым Запаветам і "Прадмоваю да Чытача" былі надрукаваны, няйнакш, ва Уздзе, куды была перавезеная колішняя Нясвіжская друкарня.

Залатою парою ў творчасці С. Буднага стаў перыяд 1573—1583 гадоў, калі ён жыў у Лоску ў вядомага беларускага магната, прыхільніка арыянаў Яна Кішкі.

У Лоску Будны знайшоў вельмі спрыяльныя ўмовы для працы. Ужо літаральна праз год ён надрукаваў пераклад Новага Запавету ў Лоску, напісаўшы да выдання "Эпіграму на герб Яна Кішкі" і грунтоўную "Прадмову да Чытача". Пасля з'яўлення Новага Запавету 1574 года імя Буднага набыло яшчэ большую папулярнасць у краінах Заходняй Еўропы — Англіі, Францыі, Германіі. Красамоўнае сведчанне шырокай вядомасці беларускага тэолага — яго перапіска з англійскім гісторыкам Еганам Фоксам. Да нашых дзён захаваўся "Ліст" Буднага да яго ад 4 мая 1574 года (цяпер ён — у Оксфардскай бібліятэцы). Аднак у С. Буднага з'явіліся не толькі новыя сябры, але і новыя апаненты — і на радзіме, і за мяжой.

У 1572—1576 гадах С. Будны браў удзел у палітычных падзеях. Па смерці ў 1572 годзе вялікага князя Жыгімонта Аўгуста ён, верагодна, далучыўся да палітычнай партыі, што была супраць абрання на вялікакняскі пасад француза Генрыха Валуа: пра гэта ўскосна сведчыць яго пераклад па-польску твора Э.В. Фрыза "Аб фурыях, альбо Французскім шаленстве" (Лоск, 1576), скіраваны супроць французскіх уладаў.

У 70-я гады XVI стагоддзя на землях Вялікага княства Літоўскага і Польшчы пачалася выпрацоўка дзяржаўна-палітычнай і этычнай дактрыны пратэстанцтва. Свой погляд на гэтыя пытанні С. Будны выказаў у творы "Абвяржэнне Чаховіца, які лічыць, што хрысціяніну нельга займаць дзяржаўную пасаду". С. Будны займаў цвёрдую пазіцыю і пры кожным зручным моманце даказваў неабходнасць урада. У 1577 годзе ён прымае чынны ўдзел у падрыхтоўцы перавыдання кнігі А.Ф. Маджэўскага "Аб выпраўленні дзяржавы", у якой прыводзіліся шматлікія гістарычныя і лагічныя аргументы ў абарону ўрада і пацвярджалася права хрыс-

*(Працяг на 6-й стар.)*

**СПОРТПЛЯЦОЎКА**

# ГУЛЯЮЦЬ УСЕ!

У снежні спартыўна-аздараўленчая камісія пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ правяла першынство універсітэта па валейболе сярод непрафесіяналаў. Мэта гэтага мерапрыемства — даць магчымасць праявіць сябе тым, хто любіць гуляць у валейбол, але не займаецца ні ў якіх секцыях.

Хаця ў спаборніцтвах бралі ўдзел усяго 6 факультэтаў, у наступным годзе плануецца павялічыць колькасць камандаў-удзельніц. Пра гэта прасілі як самі іграκі, так і тыя, хто сёлета не трапіў у іх лік.

Умовы ўдзелу былі, шчыра кажучы, досыць незвычайнымі для аматараў валейболу. Асноўная падстава для ўдзелу — непрафесіяналізм, г.зн. удзельнік не павінен займацца ў зборнай БДУ па валейболе. Да таго ж, склад каманды павінен быць змяшаным (4 дзяўчыны і 4 хлопцы). Гэтая акалічнасць напачатку бянтэжыла многіх хлопцаў, якія лічылі, што дзяўчаты не змогуць гуляць нароўні з імі. І пралічыліся: напрыклад, дзявочая палова каманды мехмата многіх саперніκаў паставіла ў цяжкое становішча сваёй прафесійнай гульнёй.

Атмасферу свята дапамаглі стварыць прызы пераможцам, якія падрыхтавала пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ. Каманда радыёфізічнага факультэта, якая заняла III месца, атрымала салодкі прыз — торт. Камандзе геафака (II месца) дасталіся штодзённікі, а прызёрам — студэнтам мехмата — падарылі майкі з эмблемамі БДУ і пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў, а таксама грашовыя прэміі. Капітаны камандаў-пераможцаў атрымалі на памяць медалі і дыпломы.

*Вольга МАЗАЛЁВА,*
*старшыня спартыўна-аздараўленчай камісіі пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ*

**НАВІНЫ СТУДГАРАДКА**

# *Срэбраныя струны – 2000*

13 і 14 снежня ў актавай зале філалагічнага факультэта прайшоў конкурс бардаўскай песні "Срэбраныя струны", наладжаны пры падтрымцы Апякунскага савета студгарадка. Штогод студэнцкі гарадок БДУ ладзіць такое мерапрыемства, і яно карыстаецца нязменным поспехам. У фестывалі, як правіла, прымаюць удзел студэнты, якія любяць і ўмеюць спяваць, граць на гітары і дарыць добры настрой сваім слухачам.

Пераможцамі ў намінацыі "Аўтар" сталі Дзмітрый Матуйза (інтэрнат № 2), І месца, Аляксандр Яшчанка і Алесь Герасіменка (абодва з інтэрната № 10), II месца, Андрэй Магазіннікаў (інтэрнат № 4), III месца.

У намінацыі "Выканаўца" першае месца заняў дуэт Дзяніса Сарканс-Лонскіса і Сяргея Мароза (інтэрнат № 2), а на другім апынуўся дуэт Сяргея Дрымука і Анатоля Куканава (інтэрнат № 3).

Прыз глядацкіх сімпатый дастаўся Аляксандру Тарасюку (інтэрнат № 4), а гран-пры — Яўгену Сілівонцу (інтэрнат № 4).

*Крысціна СТАНКЕВІЧ*

**НЕ ПРАМІНІЦЕ!**

# *Вушы – не самае галоўнае!*

Студэнцкі гарадок Белдзяржуніверсітэта ўпершыню ў гісторыі БДУ абвяшчае конкурс "Містэр Ікс — 2001".

Ты — малады, прыгожы, у меру нахабны, прывабны і абаяльны студэнт Белдзяржуніверсітэта? Ты проста ПАВІНЕН патэлефанаваць па нумары 206-52-78 (метадычны цэнтр студгарадка) і заявіць пра сваё жаданне прыняць удзел у конкурсе, які адбудзецца ў "мужчынскім" месяцы — у лютым 2001 года.

Не марудзь, бо рызыкуеш не паспець.

P.S. Узрост, рост і памер вушэй ролі не адыгрываюць!

*Інфармацыйная служба студэнцкага гарадка Белдзяржуніверсітэта*



**АСОБЫ**

# УВАСАБЛЕННЕ ВАЛЬНАДУМСТВА І СМЕЛАСЦІ

*(Працяг. Пачатак на 4-й стар.)*

ціяніна займаць свецкія пасады.

Праціўнікі С. Буднага ўзвялі на лоскага міністра паклёп, нібыта ён абвяргае боскасць Хрыста. У траўні 1582 года яны, абапіраючыся на ўласную хлусню, адлучылі яго ад збору. Ян Кішка, напэўна не надта разумеючы прыроду разыходжанняў асветніка з аднаверцамі, калі даведаўся пра рашэнне сінода, пазбавіў С. Буднага месца міністра ў Лоску і адмовіў яму ў падтрымцы. Гэта была трагічная памылка, сведчанне глыбокага ідэйнага і арганізацыйнага крызісу рэфармацыйнага руху ў Беларусі.

Пацярпеўшы няўдачу, С. Будны ўсё ж не пакінуў змагацца, а зноў узяўся за пяро. За кароткі час асветнік напісаў бліскучыя публіцыстычныя трактаты, якія склалі аснову ягонай кнігі "Аб свецкай уладзе". Яна выйшла ў студзені 1583 года з Лоскай друкарні з дазволу яе фундатара Я. Кішкі, які, няйнакш, пашкадаваў свайго былога духоўнага настаўніка.

Трагічныя падзеі 80-х гадоў XVI стагоддзя назаўсёды выбілі С. Буднага са звыклай жыццёвай каляіны. Каля 1583 года ён пакідае Лоск і, напэўна, накіроўваецца ў Іўе, у арыянскую акадэмію. Асветнік, мусіць, зноў паспрабаваў знайсці сябе на педагагічнай ніве. Ускосным доказам гэтага з'яўляецца факт ягонага супрацоўніцтва з рэктарам Іўеўскай акадэміі Янам Ліцыніем Намыслоўскім, на падручнік якога ён у 1589 годзе напісаў панегірычны верш.

Жыццёвы шлях славутага асветніка, чалавека універсальных ведаў, філосафа і прапаведніка, таленавітага пісьменніка і перакладчыка завяршыўся 13 студзеня 1593 года ў Вішневе, у доме шляхціца-пратэстанта Лявона Моклака.

**ФІЛОСАФ І АСВЕТНІК**

Арыгінальнасць С. Буднага як мысліцеля выявілася ў выпрацаванай ім этычнай дактрыне — унікальнай з'яве ва ўсёй славянскай і еўрапейскай культуры. Зыходны момант этыкі С. Буднага — адрозненне найвышэйшых маральных законаў, дадзеных Богам у 10 запаведзях Майсея і паўтораных Ісусам Хрыстом, ад законаў, усталяваных людзьмі. Божыя законы, казаў гуманіст, больш дасканалыя, бо прадугледжваюць пакаранне не толькі за злачынныя справы, але й за благія намеры.

У памкненні да сацыяльнай справядлівасці і грамадскай гармоніі С. Будны выказаў шэраг арыгінальных ідэй і прапаноў. Ён адкінуў ідэі камуністаў XVI стагоддзя, якія заклікалі зліквідаваць прыватную ўласнасць і патрабавалі ўсеагульнай роўнасці. С. Будны даказваў неабходнасць сацыяльнай няроўнасці, гаворачы, што ні Хрыстос, ні апосталы ніколі не патрабавалі знішчэння багатых і прыватнай уласнасці. Кожны чалавек, падкрэсліваў ён, можа мець маёмасць любых памераў, абы яна набывалася сумленным шляхам.

Характэрная адзнака светапогляду беларускага асветніка — антрапацэнтрызм, уяўленне пра чалавека як галоўную каштоўнасць на зямлі.

Новае прачытанне С. Будным Бібліі, пераасэнсаванне яе зместу стварылі перадумовы для перагляду традыцыйных поглядаў на Хрыстову Царкву. Услед за еўрапейскімі рэфарматарамі ён выступіў з крытыкай царкоўнай іерархіі, абсалютызаванай і абагоўленай улады Папы рымскага. Адстойваючы гуманістычныя ідэі свабоды духу, індывідуальнай вартасці чалавека, унікальнасці кожнае асобы, С. Будны сцвярджаў, што ўсякі вернік можа размаўляць з Богам без пасрэднікаў.

Асабліва палымяна С. Будны выступаў у абарону свабоды думкі і слова. Ён абураўся жорсткасцю і бесцырымоннасцю цэнзуры, што існавала ў каталіцкім касцёле і паступова ўводзілася ў пратэстанцкім зборы. Усялякае прыцясненне духу, прыніжэнне і падаўленне асобы гуманіст прыраўноўваў да найвялікшага зла. Цэнзура, паводле яго вызначэння, "ёсць ні што іншае, як падаўленне духу і панаванне чужой веры". Праціўнік усялякіх крайнасцяў, залішняй ідэйнай не-



# ЗА НОВЫ ГОД!

Навагоднія ўрачыстасці на Беларусі маюць сваю гісторыю. У дахрысціянскую эпоху нашыя продкі, як і іншыя земляробчыя народы, святкавалі Новы год з 1-га сакавіка. Пачатак вясны пачынаў і земляробчы год селяніна — пачынаўся новы этап жыцця. Традыцыі пачатку Новага года вясной мелі даволі трывалыя і моцныя карані. Нават сёння старажытныя рытуалы, звязаныя з гуканнем вясны, захаваліся ў фальклорнай традыцыі. Даўней яны працягваліся больш за месяц.

Дакладных звестак пра пераход на святкаванне Новага года з 1 студзеня гісторыя не захавала, аднак лічыцца, што гэта адбылося адначасова з прыняццем хрысціянства. Але ўжо з увядзеннем грыгарыянскага календара ў ВКЛ — дзяржаве нашых продкаў — у 1584 годзе паўсюдна адзначалі гэтае свята 1 студзеня. Новы год тады адзначаўся ў рамках калядных святак і суправаджаўся хаджэннем калядоўшчыкаў, якія віншавалі жыхароў. Аднак паступова Новы год набываў сваю адметнасць і своеасаблівыя пажаданні.



Вялікую ролю адыгрывала ў станаўленні свята і другая — "шчодрая" — калядная куцця. "Як сустрэнеш Новы год, так і жыць будзеш". Таму шчодрае застолле было вельмі дарэчы. З ім асацыіравалася багацце і дастатак. Па гэтай прычыне праводзіўся і такі рытуал: у першы дзень Новага года кожны гаспадар абыходзіў хлеў, пуню, камору і іншыя збудаванні на сваім падворку, шчодра рассыпаючы жменямі ў розныя бакі жыта, ячмень ці авёс.

На Беларусі ў Новы год праводзілася і варажба, аднак яна мела больш калядныя, чым навагоднія традыцыі.

Пасля далучэння беларускіх зямель да Расіі на нашую тэрыторыю даволі інтэнсіўна сталі пераходзіць традыцыі сустрэчы Новага года з карнавалам, феерверкамі, балямі і ёлкай, аднак на вёсцы больш распаўсюджанымі былі калядныя традыцыі. У савецкі час сустрэча Новага года набывае дзяржаўны статус (у супрацьвагу "контррэвалюцыйнаму" Нараджэнню Хрыстоваму, Калядам), але адзначаецца больш як сямейнае свята.

Сёння традыцыі сустрэчы Новага года грунтуюцца як на старадаўніх вытоках, так і на больш позніх традыцыях. Ёлка з'яўляецца абавязковым атрыбутам і сімвалізуе сабою вечнае жыццё, яго бясконцасць і неўміручасць. Звычайна Новы год сустракаюць у сямейным коле, каб "на наступны год быць разам". Гэтая традыцыя мае і карані ў савецкай эпосе, і больш даўнія вытокі. Так, па звестках даследчыка П.В. Шэйна, у XIX стагоддзі маладой жанчыне, якая была першы год замужам, нават дазвалялася ісці на перадНавагоднюю калядную вячэру да сваіх бацькоў.

Першыя тосты, што гучаць за сямейным сталом, звычайна падымаюцца за стары год. Ну, а ў дванаццаць гадзін звычайна адкрываюць шампанскае і ўздымаюць тост ужо за Новы год. Трэба адзначыць, што з-за розніцы часу з Расіяй у апошнія гады ўсё больш папулярным становіцца пачатак святочнай вячэры дзесьці ля адзінаццатай гадзіны вечара і шырока распаўсюджаны тост "за расійскі Новы год". Потым у тостах выказваюцца пажаданні на здзяйсненне асабістых жаданняў і мараў у Новым годзе. Добрай традыцыяй стала таксама тэлефанаваць сваякам і перадаваць ім навагоднія пажаданні. Распаўсюджаны і абмен падарункамі, а для дзяцей іх звычайна кладуць пад ёлку — іх, нібыта, прыносіць Дзядуля Мароз.

У першы дзень новага года запрашаюць ці, наадварот, ходзяць у госці да сваякоў, сяброў, каб павіншаваць іх з Новым годам. Святочныя застоллі ў гэты час працягваюцца.

Ёсць і некаторыя абмежаванні пры сустрэчы Новага года. Напрыклад, нельга спаць у навагодні вечар падчас сустрэчы Новага года, інакш увесь год будзе сонным. Каб не мець справы з пазыкамі, патрэбна аддаць іх усе, а таксама памірыцца з усімі, каго пакрыўдзіў ці абразіў, бо інакш у новым годзе ад цябе "адвернуцца" многія з тваіх блізкіх і сяброў. Існуюць таксама і іншыя абмежаванні, якія, аднак, не выходзяць за рамкі формулы "Як сустрэнеш, так і правядзеш". Калі ж улічыць, што наступны год распачынае новае тысячагоддзе, то пастарайцеся сустрэць яго так, каб было што ўспомніць.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт геафака*



цярпімасці і радыкалізму, С. Будны раіў найчасцей кіравацца ў жыцці прынцыпам "залатой сярэдзіны", шукаць грамадскай згоды, яднацца для пераадолення цяжкасцей, заўжды адчуваючы пры гэтым прыгажосць быцця і гармонію Сусвету.

### ЛІТАРАТАР І ПЕРАКЛАДЧЫК

Для творчасці С. Буднага, асабліва пачатковага перыяду, уласцівы непрыхаваны дыдактызм і маралізаванне — рысы, характэрныя для ўсёй старажытнай літаратуры Беларусі. Зварот да формы катэхізіса (кароткія пытанні і адказы) сведчыць пра асветніцкія памкненні аўтара. С. Будны проста і ўцямна адказваў на шматлікія пытанні, што хвалявалі сучаснікаў.

Творы С. Буднага, напісаныя ў сталым узросце, зазвычай палемічныя. Літаральна кожная праблема, закранутая асветнікам, набывала публіцыстычнае гучанне. Ён нярэдка звяртаецца да сцвярджэнняў аўтарытэтных вучоных, пераказу біблейных сюжэтаў, гістарычных паралеляў, суправаджаючы іх адпаведнымі каментарыямі. Розныя прыпавесці, асабліва біблейныя афарызмы, прымаўкі, падзеі палітычнай гісторыі таксама часта скарыстоўваліся С. Будным у літаратурнай палеміцы.

Сымон Будны — сапраўдны майстра літаратурнага перакладу. Гэты яго талент найбольш ярка выявіўся ў працы над Свяшчэнным Пісаннем. Як вядома, ён перакладаў Біблію на польскую мову, якая на той час разам са старабеларускай, царкоўнаславянскай і лацінскай была адной з літаратурных моваў Беларусі. Мяркуючы па яго ўласных выказваннях і па шматлікіх спасылках у тэксце Новага Запавету 1574 года, перакладчык карыстаўся самымі рознымі папярэднімі выданнямі і рукапісамі Свяшчэннага Пісання: лацінскімі, яўрэйскімі, грэчаскімі, славянскімі, а таксама шматлікімі творамі старажытных тэолагаў. У працы над Новым Запаветам ён абапіраўся на ранейшыя пераклады, зробленыя выдатнымі еўрапейскімі навукоўцамі: Ларэнцам Валам, Эразмам Ратэрдамскім, Марцінам Лютэрам і г.д. Са старажытных аўтараў С. Будны нязменна карыстаўся творамі Тэртуліяна, Эўсебія, Эпіфанія, Ераніма. Беларускі перакладчык меў пад рукой Біблію Скарыны, пераклад Пятра Мсціслаўца і Івана Фёдарава, Брэсцкую Біблію 1563 года, пераклад Станіслава Мужыноўскага, Чэшскую і Харвацкую Біблііі ды шэраг іншых тэкстаў Свяшчэннага Пісання.

Можна адназначна сцвярджаць: ніхто з тагачасных еўрапейскіх перакладчыкаў новазапаветных твораў не рабіў папярэдне такой грандыёзнай тэксталагічнай працы, як С. Будны. Дзякуючы надзвычайным аналітычным здольнасцям беларускага асветніка, яго таленту, эрудыцыі, глыбокай дасведчанасці ў пытаннях экзэгетыкі і дасканаламу веданню старажытных моў выданне Новага Запавету 1574 года сталася, бадай, самым высокім па ўзроўні сярод усіх вядомых на той час у Еўропе. Сам жа асветнік з характэрнай сціпласцю не лічыў яго дасканалым і пазбаўленым хібаў. Ён не разлічваў на шчодрыя ўзнагароды і не шукаў лаўраў найлепшага перакладчыка. "Якая ласка мне будзе, — пісаў ён, — не ведаю. Але пра тое зусім не дбаю. Мне досыць ужо таго, што не закапаў майго малога таленту, а прынёс карысць..."

* * *

Увесь свой век С. Будны стала жыў у Вялікім княстве Літоўскім, пісаў свае творы на вытанчанай старабеларускай мове, і таму яго творчасць належыць беларускаму народу. Але ён тварыў і па-польску і на лаціне, што дае падставы казаць пра ўклад нашага асветніка ў развіццё польскай і ўсёй еўрапейскай літаратуры і культуры. С. Будны выдатна валодаў грэчаскай і іўрытам, дзякуючы чаму здолеў адным з першых у Еўропе пераасэнсаваць змест Свяшчэннага Пісання.

Беларускі асветнік ахвяраваў дабрабытам дзеля пошуку ісціны. Як прыхільнік грамадзянскага міру і гарманічнага суіснавання розных станаў С. Будны выступаў за карэнныя грамадскія пераўтварэнні, заклікаў усталяваць новыя прынцыпы маралі, гуманныя дачыненні між людзьмі, прапаведаваў культ розуму і бараніў свабоду чалавека.

*Іван САВЕРЧАНКА,*
*кандыдат філалагічных навук*

**У НАВАГОДНЮЮ НОЧ**

# Варажба, варажба – і надзея, і журба...

Цікавіцца сваім будучым лёсам уласціва кожнаму, менавіта таму варажба карысталася вялікай папулярнасцю ва ўсе часы. Асабліва гэта датычылася прыгожай палавіны чалавецтва. А святы, асабліва перадсвяточныя вечары, былі вельмі прыдатнымі, як лічылася, для розных відаў варажбы, аднак найбольш праўдзівыя прадказанні атрымоўваліся перад Раством і Новым годам, а таксама на працягу ўсяго каляднага тыдня.



Практычна ва ўсіх народаў Еўропы жыве традыцыя варажыць на абутку. Чаравікі кідалі праз агароджу, за брамку, у акно. Існавала нават павер'е: калі абутак падаў мыском, павернутым да дому, то дзяўчына, што кінула яго, абавязкова выйдзе замуж у гэтым годзе. А пра матэрыяльную забяспечанасць будучага жаніха варажылі на фасолі. Жменю бабоў у ноч пад Новы год клалі пад падушку, а раніцай 1 студзеня выцягвалі адну з іх наўгад. Калі траплялася фасоліна ў шалупінні, то жаніх будзе заможны, калі чыстая — бедны.

Галандскія дзяўчаты ў навагодні дзень нездарма былі асабліва стараннымі. Існавала старое павер'е: тая з іх, што не паспее перарабіць усе патрэбныя справы да заходу сонца, не выйдзе замуж у наступным годзе.

А ў дзяўчат Скандынавіі нагогул ёсць свой сакрэт прычароўвання хлопцаў. Лічыцца, што калі ў навагоднюю ноч дзяўчына частавала юнака віном, у якое дабаўляла кропельку сваёй крыві, то гэты хлопец "прысыхаў" да яе ўсім сэрцам. Такі напой кахання лічыўся надзейным сродкам, правераным стагоддзямі.

Першага студзеня ў Італіі сялянкі набіралі з калодзежа "чароўную ваду", мыліся ёй і вылівалі на вуліцу. А потым праз акно назіралі: які мужчына пройдзе па лужыне першым, такі і будзе ў яе жаніх.

У навагоднюю ноч дзяўчаты паўночных краін праводзілі наступны эксперымент. У праснакі, якія яны выпякалі, клалі розную дробязь. Каму з хлопцаў трапляў праснак з пярсцёнкам, той, лічылася, у наступаючым годзе ажэніцца, каму з манетай — разбагацее. Каму давялося знайсці гузік, той застанецца халасцяком.

Польскія дзяўчаты ўвечары напярэдадні Новага года прыносілі ў хату абярэмак паленаў. Кідалі на падлогу па адным і прымаўлялі своеасаблівую лічылку: "Кавалер, удавец, кавалер, удавец". Па слове, якое прыпадала на апошняе палена, меркавалі пра таго, хто будзе мужам.

Вядома, гэта — толькі кароткі пералік таго, што практыкавалася і практыкуецца сёння. Можна было б узгадаць і абдыманне плота, і больш экзатычную варажбу ў лазні, а таксама многа іншых "метадаў" варажбы не толькі еўрапейскіх, але і ўсходніх народаў.

На мяжы тысячагоддзяў варажба на Раство і Новы год ператварылася ў своеасаблівую гульню. Але нават сёння многія ў прыкметы вераць. Так, напрыклад, кітайцы перад годам Змяі імкнуцца як мага больш ужыць змей у розных стравах, каб набыць мудрасць гэтых істот. Зразумела, шкоды такія стравы не прыносяць, але змеі вынішчаюцца зараз у гэтай краіне вельмі хутка. Аднак на пратэсты эколагаў ніхто не зважае — традыцыя! Дый бізнес гэты прыносіць даволі неблагія грошы.

Акрамя таго, чалавек заўсёды павінен верыць у лепшую будучыню, каб не згубіўся сэнс жыцця. І варажба ці добрая прыкмета будзе тут вельмі дарэчы, а на дрэнную можна проста не звяртаць увагі — ну памыліліся, з кім не бывае!..

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*студэнт IV курса геафака*

**ЗОРКІ ГАВОРАЦЬ**

# Мудрая Змяя вырашыць усе праблемы



Паводле ўсходняга календара, наступны год пройдзе пад знакам Змяі. Што вяшчуе нам гэты знак? Паспрабуем зазірнуць у гараскопы.

Кажуць, што год Змяі нясе з сабой добрыя ўмовы для вырашэння ўсіх праблем. Гэта, мабыць, асабліва ўзрадуе тых студэнтаў, хто мае хранічныя праблемы з "хвастамі". Але і тым, хто вучыцца пасляхова, таксама ёсць чаму парадавацца: наступны год будзе спрыяць вялікім адкрыццям, а таксама будзе вельмі ўдалым для мысліцеляў і філосафаў (студэнты факультэта ФСН, вы ўважліва прачыталі?), якіх будуць падтрымліваць.

Змяя прыносіць кожнаму з знакаў усходняга календара свае сюрпрызы.

ПАЦУКУ (1900, 1912, 1924, 1936, 1948, 1960, 1972, 1984, 1996) у гэты год не пашанцуе. Гараскоп раіць яму не займацца ніякімі сур'ёзнымі справамі, а лепей — штонебудзь напісаць.

БЫКУ (1901, 1913, 1925, 1937, 1949, 1961, 1973, 1985, 1997) у гэты год не варта жаніцца. Дый увогуле сямейныя праблемы ў год Змяі для гэтага знака стануць вельмі значнымі.

ТЫГРУ (1902, 1914, 1926, 1938, 1950, 1962, 1974, 1986, 1998) трэба заняцца якімінебудзь справамі ці нават выправіцца ў доўгае падарожжа.

Для КАТА, ці ТРУСА (1903, 1915, 1927, 1939, 1951, 1963, 1975, 1987, 1999), наступны год будзе вельмі спрыяльным, калі гэтаму знаку займацца развагамі, што-небудзь напісаць...

ЦМОКУ (Дракону) (1904, 1916, 1928, 1940, 1952, 1964, 1976, 1988, 2000), год падасца добрым: усё ж такі Змяя — знак блізкі!

ЗМЯЯ (1905, 1917, 1929, 1941, 1953, 1965, 1977, 1989)... Ды што тут казаць — гэта ж яе год! Яна можа рабіць усё, што прыйдзе ў галаву і нічога не баяцца. Дарэчы, яе чакаюць прыгоды ў каханні.

КОНЬ (1906, 1918, 1930, 1942, 1954, 1966, 1978, 1990) страціць галаву ад кахання. І зусім дарэмна — каханне года Змяі недаўгавечнае.

КАЗА (1907, 1919, 1931, 1943, 1955, 1967, 1979, 1991) (як вядома, жывёла цікаўная і спрытная) будзе займацца забавамі і... плёткамі ды чуткамі.

МАЛПА (1908, 1920, 1932, 1944, 1956, 1968, 1980, 1992), як і заўсёды, знойдзе сваё месца.

У ПЕЎНЯ (1909, 1921, 1933, 1945, 1957, 1969, 1981, 1993), верагодна, таксама ўзнікнуць сямейныя праблемы, як і ў некаторых іншых знакаў.

САБАКА (1910, 1922, 1934, 1946, 1958, 1970, 1982, 1994), падобна да іншых, таксама будзе займацца філасофскімі развагамі. Словам, ніякай практычнай карысці.

СВІННІ (1911, 1923, 1935, 1947, 1959, 1971, 1983, 1995) у грашах пашанцуе болей, чым многім іншым. Але затое — не пашанцуе ў каханні. Што зробіш, даводзіцца нечым ахвяраваць!

Знак Змяі нездарма спрыяе філосафам і мысліцелям — гэтая істота здаўна сімвалізуе мудрасць. Мужчын, народжаных у гэты год, характарызуюць сентыментальнасць і гумар, а жанчын — прыгажосць і поспех у супрацьлеглага пола. Змяя — асоба вытанчаная. Яна не любіць балбатаць, шмат разважае, вызначаецца цудоўнай інтуіцыяй.

Змяя даводзіць усе справы да канца. Мабыць, таму ёй так шанцуе ў грашовых справах. І тым не менш, у Змяі вельмі вялікая лянота...


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

*Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана да друку ў 12.00*

*21 снежня*
*Зак. 848у*
*Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Яўгена Балаша*